**Р. У. Серыкаў, Л. П. Кузьміч**
**г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны**

# НЕЙРАЛІНГВІСТЫЧНЫЯ ПРЫЁМЫ АКТЫВІЗАЦЫІ ЎВАГІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ніхто не будзе спрачацца наконт таго, што выкладанне як працэс уяўляе сабой, па вялікім рахунку, узаемадзеянне (найперш вербальнае), якое прадугледжвае як непасрэдны ўплыў на аўдыторыю (унушэнне) з боку выкладчыка, так і адваротную рэакцыю слухачоў як на выкладчыка, так і на тую інфармацыю, якую ён ім прапаноўвае. Задача апошняга (лектара ва ўніверсітэце, настаўніка ў школе, метадыста на курсах павышэння кваліфікацыі) – «павесці» за сабой аўдыторыю, данесці думку, даказаць яе слушнасць і каштоўнасць, задаць патрэбны накірунак разважанняў, падрыхтаваць глебу для з'яўлення самастойных вывадаўу слухачоў. Такая думка праходзіць скразным лейтматывам у лепшых педагагічных працах і падручніках [1; 2; 3; 4].

Але кожны ўрок, як і кожная лекцыя, заўсёды мае свой пачатак, які прадугледжвае так званы «арганізацыйны момант». Гэты першы этап з'яўляецца надзвычай важнай структурнай часткай лекцыі (мы як выкладчыкі вышэйшай школы будзем далей ужываць тэрмін *лекцыя*), і вядомая прыказка – *добры пачатак – палова справы* – выступае тут важным арыенцірам на поспех. Студэнцкая аўдыторыя «дастаецца» выкладчыку пасля самых розных акалічнасцей: калі гэта першая змена і першая па́ра, то – пасля ранішняга сну і снедання, калі гэта першая пара другой змены, то – звычайна пасля абеду, а калі вашыя заняткі ідуць пасля нейкага іншага прадмета, то вам дастаецца студэнцкая група пасля пэўнага папярэдняга выкладчыка, г. зн. са «слядамі» ягонага ўздзеяння.

Такім чынам, вы пераймаеце эстафету ў навучанні самых розных студэнтаў: заспаных, узбуджаных, абыякавых, настроеных па-рабочаму, разленаваных, унутрана ізаляваных, згуртаваных і г. д. Гатовым трэба быць да ўсяго, і калі вашыя заняткі не першыя па раскладу, то нялішнім будзе мець хаця б нейкае ўяўленне пра таго педагога, хто займаўся з гэтай акадэмічнай групайпапярэдне. Калі папярэдні выкладчык схільны ўсыпляць аўдыторыю, то гэтую групу студэнтаў варта «разбудзіць», калі ж ён іх, наадварот, адчувальна «ўзрушыў», то трэба,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

натуральна, супакоіць. У любым выпадку, група патрабуе некаторага часу на пераключэнне на новы рытм працы і на ўспрыняцце чарговага выкладчыка, якім якраз вы і з'яўляецеся.

Паколькі апошнім часам ва ўсіх навучальных установах рэспублікі шырока пачалі прымяняцца мультымедыйныя сродкі з прычыны больш эфектыўнага запамінання вялікай колькасці інфармацыі пры дапамозе зрокавага ўспрыняцця (лічыцца, што да 70 % аб'ёму), перад пачаткам лекцыі варта ўключыць праектар з тэматычнай прэзентацыяй, але з адпаведным «сітуацыйным» тытульным слайдам. Напрыклад, увайшоўшы ў аўдыторыю яшчэ за пяць-дзесяць хвілін да званка, каб настроіць праектар, выкладчык можа лёгка сарыентавацца ў дамінуючым настроі студэнтаў, і гэта можа быць: 1) або празмерная іх узбуджанасць, або 2) непажаданая «неканструктыўная» вяласць. У першым выпадку выкладчык праецыруе на сцяну тытульны слайд «адваротнага настрою»: лагодныя марскія (лясныя, горныя) пейзажы, абстрактныя малюнкі з плаўнымі абрысамі і г. д. на свой густ. У другім выпадку на экран праецыруецца яркі слайд з дынамічным сюжэтам: гарадскі рух, хуткасны цягнік, штармавое мора, альпіністы на ўзыходжанні ў горы (ідэальным з'яўляецца запуск адпаведнага кліпу працягласцю 1–2 хвіліны). Усе вышэйназваныя маніпуляцыі ўяўляюць сабой невербальнае ўзаемадзеяне з аўдыторыяй, робяцца без каментарыяў і тлумачэнняў, быццам «выпадкова», «проста так». Таму для пачатку любой прэзентацыі выкладчыку выгадна мець па два тытульныя слайды (на ўсялякі выпадак, у залежнасці ад сітуацыі) для адной і той жа прэзентацыі, якія ідуць адзін за другім і якія незаўважна дапамогуць загадзя сфарміраваць адпаведны настрой студэнцкай аўдыторыі.

Для мабілізацыі ўвагі слухачоў і настройкі іх на рабочы лад (асабліва калі справа датычыць «складаных» дысцыплін і тэм) мэтазгодна прымяніць, як паказала практыка, так званы «кантэкст згоды», заснаваны на інертнасці нашага мыслення, які паспяхова прымяняецца многімі вядучымі айчыннымі і замежнымі псіхолагамі ў значна больш экстрэмальных умовах, чым нашая акадэмічная лекцыя [5].

Пачатак лекцыі патрабуе пэўнага высілку: гэта як момант кранання з месца аўтамабіля ці адрыву самалёта ад узлётнай паласы, калі адчувальны і расход паліва, і пэўны дыскамфорт пры перагрузцы. У гэты кароткі прамежак часу выкладчыку вельмі карысна і выгадна настроіць студэнтаў на пазітыўнае ўспрыняцце самога сябе і сваёй тэмы. Для гэтага аўдыторыі задаецца *тры* загадзя падрыхтаваныя «несур'ёзныя» пытанні, на якія яна хорам і ўразнабой адказвае толькі станоўча і звычайна з усмешкай. Потым, пасля такіх станоўчых калектыўных адказаў, выкладчык *дае каманду*, якая па інерцыі мыслення слухачоў ўспрымаецца як ажыццявімая і пазітыўная, і адказ на якую маркіруецца толькі як станоўчы. Напрыклад: Выкладчык: «Добры дзень! Сядайце. Сёння ў нас серада?» (1) – Студэнты: «Так». – Выкладчык: «Чытаць умееце?» (2) – Студэнты: «Так!»– Выкладчык: «Пісаць умееце?» (3) – Студэнты: «Так!!!» – Выкладчык: «Значыць, сённяшнюю тэму вы засвоеце лёгка і на ўсё жыццё! (*каманда*). А гучыць наша тэма так…»

Безумоўна, пытанні да аўдыторыі павінны вар'іравацца, і іх непажадана ўжываць як штамп у пачатку кожных заняткаў, але станоўчы адказ на іх з боку студэнтаў павінен быць «гарантаваны» абавязкова. Выкладчык: «Добры дзень! Сядайце. Відаць, на лекцыю сёння прыйшлі толькі тыя, хто прачнуўся?» (1) – Студэнты: «Так». – Выкладчык: «І што? На ўсё пра ўсё нам адведзена толькі 90 хвілін?» (2) – Студэнты: «Так!» – Выкладчык: «Прыемныя сюрпрызы любіце?» (3) – Студэнты: «Так!!!» – Выкладчык: «Значыць, сённяшнюю тэму мы разгледзім крыху незвычайна і запамінальна (*каманда*). Гучыць яна так…» (Але гэткага роду заявы пра розныя «незвычайнасці» дапускаюцца толькі ў тых выпадках, калі заняткі сапраўды плануецца правесці нетрадыцыйна або з нейкім элементам навізны).

Чаго нельга пры гэтым рабіць, дык гэта, канешне, тлумачыць студэнтам, для якой мэты вы задаеце ім гэтыя пытанні і праецыруеце адпаведныя тытульныя слайды. Зрэшты, узгаданы «кантэкст згоды» можа прымяняцца на любым этапе заняткаў, нават пры індывідуальным апытванні студэнта, які адчувае сябе няўпэўнена і па нейкай прычыне «запраграмаваўся» на няўдачу. Падняцце такім чынам самаацэнкі візаві і ўзмацненне ў ім веры ў «перамогу» над матэрыялам безумоўна сябе апраўдвае і павышае давер студэнта да выкладчыка, які пранікся ягоным клопатам і спагадліва намагаецца яму дапамагчы.

У сярэдзіне лекцыі ўвага слухачоў, як правіла, значна зніжаецца, і тут патрабуецца прыўнясенне эфекту навізны і свежасці ўспрыняцця інфармацыі. Звычайныя прамыя заклікі («Увага на дошку (на слайд)!») і прымус («Пішам і не размаўляем!») хоць на нейкі час і абвастраюць увагу, але выклікаюць унутранае супраціўленне слухачоў: яны стаміліся. У гэты час сярод іх пачынаецца перашэптванне і ўпаданне ў транс. Як толькі ўвага да лекцыі знізілася, адным з карысныхметадаў на шляху да вывядзення яе на рабочы ўзровень і абвастрэння ўспры-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

няцця будзе наступная тэхніка, якая складаецца з трох крокаў: 1) «спачуванне» слухачам, суперажыванне з заглыбленнем у іх «маары», 2) выяўленне рэсурсных пачуццяў (прыемнасць, асалода, задавальненне) у іх роздумах «не па тэме», 3) накладанне выяўленых рэсурсных пачуццяў на наступнае пытанне лекцыі.

Прывядзём канкрэтны прыклад у кантэксце тэмы «Фанетычныя змены дапісьмовай эпохі» для студэнтаў-філолагаў. Ідзе лекцыя, пачатак якой быў вытрыманы ў прапанаваных вышэй тэхніках, аўдыторыя была мабілізавана, настрой прыўзняты. К палове лекцыі сітуацыя змянілася не ў карысць лектара: адчувальна знізілася ўвага аўдыторыі, чуцен «нерабочы» шумок, заўважаюцца расфакусіраваныя погляды студэнтаў (абыякавае выражэнне твараў), матэрыял запісваецца імі механічна. Адчуўшы такі момант, выкладчык тут жа прымае на сябе ініцыятыву і «спачувальна» цікавіцца:

– Стаміліся? Цяжкавата пра ўсё гэта слухаць, праўда?

– Так! Праўда! (Студэнты адказваюць на такія пытанні з лёгкім ажыўленнем і здзіўленнем па той прычыне, што выкладчык «на іх баку»!).

– Пра што вам зараз думаецца? Чаго хочацца?

– Надвор'е такое добрае … восень такая прыгожая … зараз бы ў лес куды … ці дадому паехаць … ці каля рэчкі пасядзець … ды хоць проста ў парк можна … марожанага паесці …

– Праўду кажаце. І мне так хочацца з вамі разам: і марожанага, і ў парк, і ў лес! Вось гэта сапраўдная асалода, не тое, што нейкія фанетычныя змены дапісьмовай эпохі і нейкае першае поўнагалоссе! Падумаць толькі: гэтыя вучоныя, якія звярнулі ўвагу на поўнагалосныя формы ва ўсходнеславянскіх мовах і адкрылі механізм іх утварэння, зрабілі гэта таксама з нейкай цікавасці і атрымалі нейкую велізарнейшуюасалоду! Бо быць такога не можа, каб зрабілі яны нам гэта назло, каб толькі паздзекавацца з нас і занудзіць дашчэнту! Давайце-ка зараз глянем, якую асалоду яны тут атрымлі…

Увага студэнтаў пасля такога нечаканага вяртання да тэмы зноў павышаецца, адчуваецца паблажліва-даравальнае стаўленне публікі да гэтых «дзіўных» вучоных з іх праблемамі, паступова нарастае добрая рабочая зацікаўленасць пытаннем. Праўда, у канцы лекцыі неабходна будзе рэзюміраваць разважанні такім чынам, каб паказаць, у чым жа знайшлі «асалоду» тыя мудрыя вучоныя, адкрыўшы закон поўнагалосся. Названая тэхніка хуткацечная, яна не патрабуе зацягнутасці і «грунтоўнасці» спачування, падрабязнага распытвання, робіцца нібы мімаходзь і незаўважна, на працягу 0,5–1 хвіліны.

Такім чынам, прапанаваныя прыёмы сапраўды дапамагаюць на пачатковым этапе занятkаў адаптавацца студэнтам да чарговага выкладчыка, хутка ўвайсці ў стан эмацыянальнай раўнавагі, мабілізавацца да заняткаў і ахвотна прыняцца за работу, а ў патрэбны момант – перажыць эфект навізны ўспрыняцця інфармацыі і завастрыць увагу слухачоў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1 Карпович, Т. Е. Основы педагогики. Практикум / Т. Е. Карпович. – Минск : Тесей, 2007. – 176 с.

2 Кухарев, Н. В. На пути к профессиональному совершенству / Н. В. Кухарев. – М. : Просвещение, 1990. – 160 с.

3 Основы педагогики / А. И. Жук, И. И. Казамирская, О. Л. Жук, Е. А. Коновальчик ; под ред. А. И. Жука. – Минск : Аверсэв, 2003. – 350 с.

4 Сивашинская, Е. Ф. Лекции по педагогике. Интегрированный курс : в 2 ч. / Е. Ф. Сивашинская. – Минск : Жасскон, 2008. – Ч. 2. – 192 с.

5 Владиславова, Н. Базовые техники NLP и хорошо сформированный результат / Н. Владиславова. – М. : София, 2013. – 287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ